**М.А.ЯЦЭВІЧ**

# СТАН І ПРАБЛЕМЫ БІБЛІЯТЭЧНАЙ АДУКАЦЫІ БЕЛАРУСІ

Бесперапынная сістэма бібліятэчнай адукацыі бярэ свой пачатак з прафарыентацыйнай работы ў сярэдняй школе, калі намаганнямі школьных бібліятэкараў вучням прывіваюцца першыя элементы інфармацыйнай культуры. Менавіта ў гэты час малады чалавек вырашае свой далейшы лёс – вызначэнне прафесіі, якой бы ён хацеў авалодаць. Затым праца ўжо вядзецца ў сярэдніх і вышэйшых навучальных установах, якія ў рамках прафарыентацыйнай работы рыхтуюць кантынгент будучых абітурыентаў, вырашыўшых звязаць свой лёс з кваліфікацыяй "бібліятэкар-бібліёграф".

На сённяшні дзень у Беларусі склалася сістэма бібліятэчнай адукацыі, якая мае чатыры асноўныя ўзроўні: сярэдняя спецыяльная адукацыя, вышэйшая (бакалаўрыят, магістратура), падрыхтоўка навуковых кадраў, павышэнне кваліфікацыі.

Першы ўзровень – сярэдняя спецыяльная адукацыя – прадстаўлены Магілёўскім бібліятэчным тэхнікумам, які адзначыў восенню 1996 г. свой 50–гадовы юбілей, і Мінскім лінгвагуманітарным комплексам "гімназія – каледж".

Магілёўскі бібліятэчны тэхнікум мае трывалыя традыцыі ў падрыхтоўцы бібліятэкараў-бібліёграфаў сярэдняй кваліфікацыі. У ім працуе высокакваліфікаваны педагагічны калектыў. На працягу апошніх трох гадоў імі значна перапрацаваны вучэбныя планы і праграмы навучання, адкрыта шэраг новых кваліфікацый: "сакратар-рэферэнт", "аператар аўтаматызаваных бібліятэчна-інфармацыйных сістэм", "арганізатар клубнай работы",

"арганізатар музейнай справы". Магілёўскі бібліятэчны тэхнікум мае сучасны камп'ютэрны клас, прыдатныя для заняткаў і добра аформленыя аўдыторыі і лабараторыі.

Тэхнікум актыўна супрацоўнічае з факультэтам бібліятэчна-інфармацыйных сістэм (ФБІС) Беларускага універсітэта культуры, асабліва ў плане пераймальнасці адукацыі. Разам падрыхтаваны вучэбныя планы і праграмы з улікам гэтай пераймальнасці. З 1994 г. па дамоўленасці з Беларускім універсітэтам культуры ў тэхнікуме фарміруецца каледжная група, у якой ажыццяўляецца падрыхтоўка бібліятэкараў з больш паглыбленым вывучэннем спецыяльных дысцыплін. У групе займаюцца лепшыя студэнты, навучанне доўжыцца дадаткова яшчэ адзін год. Пасля заканчэння каледжнай групы выпускнікі без уступных экзаменаў (на ўмовах гутаркі) залічваюцца на III курс ФБІС. Выхаванцы тэхнікума паступаюць таксама і на факультэт завочнага навучання Беларускага універсітэта культуры са скарочаным тэрмінам навучання.

Мінскі лінгвагуманітарны комплекс "гімназія – каледж" у пэўнай ступені выступае ў якасці канкурэнта Магілёўскаму бібліятэчнаму тэхнікуму. Тры гады таму на яго базе быў створаны клас па спецыялізацыі "менеджмент бібліятэчна-інфармацыйных сістэм", у выніку заканчэння якога можна атрымаць сярэднюю спецыяльную падрыхтоўку. Акрамя гэтага, паміж Мінскім лінгвагуманітарным комплексам "гімназія – каледж" і Беларускім універсітэтам культуры падпісана дамова, згодна якой лепшыя выпускнікі каледжа, якія здалі дзяржаўныя экзамены на "добра" і "выдатна" і пажадалі прадоўжыць навучанне па абранай спецыяльнасці, залічваюцца без уступных экзаменаў на III курс ФБІС універсітэта. Быў распрацаваны спецыяльны вучэбны план. Зараз ідзе актыўная праца над удасканален-

нем вучэбных праграм. Пры гэтым асаблівая ўвага надаецца пераемнасці зместу дысцыплін для сярэдняй і вышэйшай бібліятэчнай адукацыі.

Трэба адзначыць, што выпускнікі лінгвагуманітарнага комплекса – адны з лепшых студэнтаў універсітэта культуры. Яны свабодна валодаюць некалькімі замежнымі мовамі, добра ведаюць камп'ютэрную тэхніку, бібліятэчна-інфармацыйную дзейнасць. Такія спецыялісты вельмі патрэбны ў бібліятэках і інфармацыйных службах, асабліва ў тых, якія маюць значныя фонды замежнай літаратуры. Яны могуць знайсці сябе і ў недзяржаўных інфармацыйных установах, рэкламных агенцтвах і інш.

Другі ўзровень сістэмы бібліятэчнай адукацыі складае вышэйшая адукацыя на ФБІС Беларускага універсітэта культуры. Факультэт перайшоў на новыя вучэбныя планы пяцігадовага тэрміна навучання. Статус універсітэта патрабуе высакаякаснай падрыхтоўкі бібліятэчных работнікаў. Сёння на ФБІС бібліятэкары-бібліёграфы рыхтуюцца па дзесяці спецыялізацыях: "аўтаматызаваныя бібліятэчна-інфармацыйныя сістэмы", "публічныя бібліятэкі", "дзіцячыя і школьныя бібліятэкі", "навукова-тэхнічныя бібліятэкі", "менеджмент і маркетынг бібліятэчнай справы", "бібліятэказнаўства, бібліяграфія і замежная мова", "бібліятэказнаўства, бібліяграфія і беларуская мова і літаратура", "бібліятэказнаўства і краязнаўства", "бібліятэказнаўства, бібліяграфія і кніжны гандаль", "старажытная і рэдкая кніга".

На 1 сакавіка 1997 г. на ФБІС навучалася 330 чалавек, з іх 40 платных. За апошнія гады адбылося значнае зніжэнне набору на факультэт, што выклікае трывогу. На сённяшні дзень і яшчэ мінімум пяць гадоў ФБІС не зможа

цалкам задаволіць патрэб бібліятэк у маладых спецыялістах з вышэйшай адукацыяй. Неабходна аб'яднацца і выкладчыкам, і бібліятэчнай грамадскасці, і Бібліятэчнай асацыяцыі, каб астанавіць негатыўную тэндэнцыю і дабіцца значнага павышэння набору студэнтаў на факультэт.

Укараненне новых інфармацыйных тэхналогій у бібліятэках, змяненне іх сацыяльнага статуса ва ўмовах пераходу да рынычных адносін прад'яўляюць новыя патрабаванні да кваліфікацыі і падрыхтоўкі спецыялістаў. Таму пытанні аўтаматызацыі бібліятэк, бібліятэчнага менеджменту і маркетынгу павінны стаць базавымі пры выкладанні ўсіх спецыяльных дысцыплін. Яны таксама павінны быць пакладзены ў аснову падрыхтоўкі стандарта і новага вучэбнага плана па спецыяльнасці "бібліятэказнаўства і бібліяграфія", якія павінны быць набліжаны да сусветных стандартаў адукацыі.

Прафесійная падрыхтоўка сучаснага бібліятэкара немагчымая без фундаментальнай агульнанавуковай, гуманітарнай падрыхтоўкі. Ён павінен валодаць ведамі ў галіне філасофіі, гісторыі, эканомікі, псіхалогіі, літаратуры. Спецыяліст павінен ведаць дзве замежныя мовы. Асаблівае значэнне ў новых сацыяльна-эканамічных умовах набывае блок эканамічных дысцыплін, які ў дзеючым вучэбным плане з'яўляецца адным з самых слабых. Патрабуе ўзмацнення агульнагуманітарная падрыхтоўка тых студэнтаў, што займаюцца па скарочанай форме навучання.

Слабым месцам вышэйшай адукацыі з'яўляецца яе матэрыяльна-тэхнічнае і інфармацыйна-тэхналагічнае забеспячэнне. Навучанне інфармацыйным тэхналогіям па некаторых напрамках адстае ад бібліятэчнай практыкі. На

ФБІС адсутнічаюць сучасная камп'ютэрная лабараторыя, выхад у Internet, а камп'ютэрныя класы універсітэта ўкамплектаваны напалову састарэлай тэхнікай і вельмі загружаны. Адсутнічаюць новыя праграмныя сродкі аўтаматызацыі бібліятэчна-інфармацыйных працэсаў. Выкладчыкі факультэта, каб выйсці з гэтага складанага становішча, усё часцей праводзяць практычныя заняткі ў буйнейшых бібліятэках г. Мінска, але гэта нельга назваць аптымальным варыянтам.

Неабходна камп'ютэрная лабараторыя факультэта са сродкамі мультымедыя, прыкладным праграмным забеспячэннем, анлайнавым доступам у рэгіянальныя і галіновыя аўтаматызаваныя бібліятэчна-інфармацыйныя сістэмы (АБІС) і Internet. Дысплейны час на аднаго студэнта павінен складаць не менш за 50 гадзін у год. На базе створанай лабараторыі можна было б вучыць інфармацыйным тэхналогіям не толькі студэнтаў, але і на камерцыйных умовах павышаць кваліфікацыю бібліятэкараў Беларусі, займацца перападрыхтоўкай выкладчыкаў. Факультэтам зроблены шэраг захадаў (у асноўным гэта гранты) па набыцці камп'ютэрнай лабараторыі, але яны пакуль не далі вынікаў.

Мала фінансавых сродкаў выдаткоўваецца на камплектаванне фонду бібліятэкі універсітэта і спецыяльных кафедраў новымі перыядычнымі выданнямі па спецыяльнасці, рознымі відамі іншых дакументаў, інфармацыйнымі і бібліяграфічнымі выданнямі. Для правядзення лабараторных заняткаў па розных дысцыплінах не хапае табліц класіфікацый: ББК, УДК, інфармацыйна-пошукавых тэзаўрусаў, рубрыкатараў ГАСНТІ і інш. Бібліятэка універсітэта павінна стаць «палігонам» у падрыхтоўцы спецыялістаў па аўтаматызацыі бібліятэчнай справы.

Неабходна дбаць аб павышэнні кваліфікацыі выкладчыкаў ФБІС па інфармацыйных тэхналогіях, арганізаваць стажыроўку ў буйнейшых бібліятэках, якія маюць АБІС, дабівацца яе павелічэння з аднаго месяца да двух–трох. Патрабуе паступовага амалажэння выкладчыцкі склад, сярэдні ўзрост якога сёння складае звыш 50 гадоў. Для гэтага больш актыўна неабходна выкарыстоўваць магчымасці магістратуры і аспірантуры.

Для пашырэння сваёй нішы ў падрыхтоўцы спецыялістаў факультэт бібліятэчна-інфармацыйных сістэм павінен сур'ёзна заняцца адкрыццём новай інфармацыйнай спецыяльнасці. Такі вопыт існуе ў вядучых вышэйшых навучальных установах СНД, у якіх адкрыта спецыяльнасць "інфармацыйныя сістэмы". Шмат выпускнікоў ужо працуюць у інфармацыйных службах розных формаў уласнасці, дык чаму ж не рыхтаваць такіх спецыялістаў мэтанакіравана. Факультэтам было распрацавана абгрунтаванне спецыяльнасці "навукова-інфармацыйная дзейнасць" з наступнымі спецыялізацыямі: "інфармацыйнае забеспячэнне маркетынгавай дзейнасці", "рэкламная і выставачная дзейнасць", "інфармацыйнае забеспячэння навукі і вытворчасці", "інфармацыйнае забеспячэнне сферы кіравання". У якасці кваліфікацыі прапаноўвалася–"аналітык-рэферэнт". Аднак прапанова не атрымала падтрымкі на ўзроўні універсітэта. Трэба зрабіць новыя захады ў гэтай справе.

З 1995 г. вышэйшая бібліятэчная адукацыя ў Беларусі таксама стала шматузроўневай – пачата падрыхтоўка бакалаўраў і магістраў. Права залічэння ў бакалаўрыят маюць лепшыя студэнты ФБІС. Яны на працягу трох семестраў дададкова да асноўнай вучэбнай праграмы паглыблена вывучаюць спецыяльныя дысцыпліны агульным аб'ёмам 300 гадзін. Навучанне заканчваецца абаронай бакалаўрскай

працы.

У магістратуру па спецыяльнасці "бібліятэказнаўства і бібліяграфія" прымаюцца спецыялісты, якія маюць дыплом аб вышэйшай бібліятэчнай адукацыі. Перавага аддаецца тым, хто мае дыплом акадэмічнай ступені бакалаўра. Навучанне ў магістратуры доўжыцца адзін год і ўключае тэарэтычныя і практычныя заняткі, педагагічную практыку. Навучэнцам, якія паспяхова здалі выпускныя экзамены і абаранілі магістэрскую працу, прысвойваецца акадэмічная ступень магістра гуманітарных навук.

На жаль, на дзяржаўным узроўні яшчэ не вызначаны прафесійны і сацыяльны статус бакалаўраў і магістраў, а таксама, якія прыярытэтныя пасады яны будуць займаць, якія ў гэтым будуць мець перавагі, як будзе аплачвацца іх праца. Неабходна звярнуцца ў Міністэрства культуры з просьбай аб прыняцці адпаведнага нарматыўнага дакумента, у якім будуць рэгламентаваны парадак размеркавання бакалаўраў і магістраў і ўмовы аплаты іх працы.

Трэці ўзровень звязаны з падрыхтоўкай навуковых кадраў. Яшчэ нядаўна скончыць аспірантуру і атрымаць вучоную ступень кандыдата ці доктара навук па спецыяльнасці "бібліятэказнаўства і бібліяграфія" было магчыма толькі ў Маскоўскім і Санкт-Пецярбургскім універсітэтах культуры. Цяпер гэта можна здзейсніць і ў Беларускім універсітэце культуры, дзе адкрыты аспірантура і дактарантура. У аспірантуру прымаюцца асобы, якія маюць вышэйшую адукацыю і вопыт практычнай работы па спецыяльнасці. Навучанне ажыццяўляецца ў трох формах: вочнай ( тры гады), завочнай (чатыры гады) і суіскальніцтва. Падчас навучання суіскальнікі павінны праслухаць курс лекцый і здаць кандыдацкія экзамены па філасофіі, замеж-

най мове, бібліятэказнаўству і бібліяграфіі, педагогіцы вышэйшай школы, а таксама падрыхтаваць дысертацыйную работу.

Пасля паспяховай абароны дысертацыі, якая адбываецца ў спецыялізаваным вучоным савеце Беларускага універсітэта культуры, суіскальніку прысуджаецца вучоная ступень кандыдата педагагічных навук па спецыяльнасці "бібліятэказнаўства і бібліяграфія".

У дактарантуру залічваюцца асобы, якія маюць вучоную ступень кандыдата навук, вопыт і дасягненні ў навукова-даследчай рабоце. Мэтай навучання ў дактарантуры з'яўляюцца падрыхтоўка і абарона доктарскай дысертацыі. Аднак трэба адзначыць як недахоп той факт, што ў дактарантуры Беларускага універсітэта культуры па спецыяльнасці "бібліятэказнаўства і бібліяграфія" пакуль ніхто не займаецца. Дактары навук вельмі патрэбныя ФБІС. Пакуль што ў Беларусі па профільнай спецыяльнасці ёсць толькі адзін доктар педагагічных навук – В.Е.Лявончыкаў, які працуе на факультэце.

Чацвёрты ўзровень падрыхтоўкі звязаны з павышэннем кваліфікацыі. Роля яе ў апошні час значна ўзрасла. Гэта звязана са зменамі ў прымяненні інфармацыйных тэхналогій у бібліятэках, са з'яўленнем новай камп'ютэрнай тэхнікі, аперацыйных сістэм і прыкладнога праграмнага забеспячэння для аўтаматызацыі бібліятэчна-інфармацыйных працэсаў. Вышэйшыя і сярэднія спецыяльныя вучэбныя установы не могуць хутка рэагаваць на гэтыя змены, таму што яны ў першую чаргу прызначаны для фундаментальнай, базавай падрыхтоўкі спецыялістаў. Сістэма ж павышэння кваліфікацыі павінна аператыўна рэагаваць на змены ў бібліятэчнай навуцы і практыцы.

Павышэнне кваліфікацыі работнікаў бібліятэк (уда-

сканаленне іх прафесійных ведаў, уменняў і навыкаў, дасягненне высокага агульнаадукацыйнага ўзроўню) ажыццяўляецца ў Беларускім інстытуце праблем культуры (БелІПК), інстытутах павышэння кваліфікацыі (ІПК) асобных міністэрстваў і ведамстваў, а таксама ў бібліятэках – метадычных цэнтрах.

БелІПК здзяйсняе павышэнне кваліфікацыі ў асноўным для публічных бібліятэк сістэмы Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь. Заняткі праводзяцца ў выглядзе кароткатэрміновых курсаў – на працягу некалькіх тыдняў. Для працы запрашаюцца выкладчыкі факультэта бібліятэчна-інфармацыйных сістэм Беларускага універсітэта культуры, прадстаўнікі органаў кіравання культурай, вядучыя спецыялісты буйнейшых бібліятэк. Тэматыка курсаў арыентавана на вузкае кола спецыялістаў: бібліёграфы, камплектатары ЦБС, дырэктары ЦБС і інш.

Акрамя БелІПК, павышэннем кваліфікацыі супрацоўнікаў бібліятэк іншых тыпаў займаюцца ІПК іншых міністэрстваў. Напрыклад, інстытуты павышэння кваліфікацыі педагагічных работнікаў розных узроўняў праводзяць курсы павышэння кваліфікацыі для супрацоўнікаў школьных бібліятэк.

Рэспубліканскія галіновыя бібліятэкі таксама займаюцца павышэннем кваліфікацыі бібліятэкараў сваёй сеткі ў форме кароткатэрміновых курсаў, навукова-практычных канферэнцый і семінараў, школ дырэктараў і інш. Значных поспехаў у гэтым накірунку дасягнула, напрыклад, БелСГБ, на базе якой неаднаразова праходзілі курсы павышэння камп'ютэрнай пісьменнасці. Аднойчы такія курсы прайшлі па заказу гэтай бібліятэкі ў Беларускім універсітэце культуры.

Нягледзячы на пэўныя дасягненні, можна канстатаваць, што ў Беларусі адсутнічаюць цэласная сістэма і адзіны цэнтр перападрыхтоўкі і павышэння кваліфікацыі бібліятэчных кадраў, асабліва ў галіне інфармацыйных тэхналогій для бібліятэк розных тыпаў і сістэм. БелІПК ажыццяўляе павышэнне кваліфікацыі для публічных бібліятэк, вельмі мала ўвагі надае інфармацыйным тэхналогіям. Павышэнне кваліфікацыі ў галіновых бібліятэках не заўсёды можна назваць прадукцыйным з-за адсутнасці для гэтага ўмоў, вучэбных планаў і праграм, адпаведных педагагічных навыкаў. Таму мэтазгодна арганізацыйна сканцэнтраваць павышэнне кваліфікацыі ў Беларускім універсітэце культуры, стварыўшы там адпаведны факультэт павышэння кваліфікацыі.

У Беларусі адсутнічае таксама сістэма паслядыпломнай адукацыі для тых спецыялістаў, якія маюць вышэйшую адукацыю (часта ў галіне інфарматыкі і вылічальнай тэхнікі), працуюць або хацелі б працаваць у бібліятэках (і якія там вельмі неабходныя), але не маюць спецыяльных ведаў ў галіне бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасці. Паскоранае атрыманне вышэйшай бібліятэчнай адукацыі магчымае на факультэце паслядыпломнай падрыхтоўкі, які можна было б стварыць разам з факультэтам павышэння кваліфікацыі і назваць, напрыклад, факультэтам паслядыпломнай падрыхтоўкі і павышэння кваліфікацыі.

Такім чынам, можна канстатаваць, што ў Беларусі ўвогуле існуе бесперапынная сістэма падрыхтоўкі і павышэння кваліфікацыі бібліятэчных работнікаў. Ёсць пэўныя дасягненні на кожным з узроўняў гэтай сістэмы, але шмат і нявырашаных праблем. Трэба актыўна працаваць над тым, каб гэтая сістэма была пераймальнай і звязанай у адзінае

цэлае. Мэтамі павінны стаць удасканаленне падрыхтоўкі бібліятэкараў, адпаведнасць яе сучасным патрабаванням бібліятэчна-інфармацыйных тэхналогій, сацыяльнаму статусу бібліятэкі і міжнародным стандартам.

Л. Ф. ПЛАТОНЕНКА

## БЕСПЕРАПЫННАЯ СІСТЭМА ПАДРЫХТОЎКІ БІБЛІЯТЭКАРАЎ У КОМПЛЕКСЕ "МАГІЛЁЎСКІ БІБЛІЯТЭЧНЫ ТЭХНІКУМ – БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ КУЛЬТУРЫ"

1996 г. з'явіўся юбілейным для адзінай сярэдняй спецыяльнай навучальнай установы ў рэспубліцы, якая рыхтуе бібліятэкараў для публічных бібліятэк.

Пачатак дзейнасці тэхнікума прыпадае на 1946 г. Ён створаны згодна з пастановай Савета Народных Камісараў БССР ад 26 кастрычніка 1945 г. (№ 1638) спачатку як Мінскі бібліятэчны тэхнікум. У сувязі з адсутнасцю адпаведнай матэрыяльнай базы ўрачыстае адкрыццё навучальнай установы адбылося ў 1946 г. у Магілёве ў памяшканні Рэспубліканскага культасветвучылішча імя Н.К.Крупскай. З 1946 г. тэхнікум знаходзіўся ў Мінску.

З 1 кастрычніка 1961 г. навучальная ўстанова была пераведзена ў Магілёў, дзе і працягвае сваю дзейнасць да гэтага часу. У структуры тэхнікума ёсць дзённае і завочнае аддзяленні.

За 50 гадоў існавання падрыхтавана і выпушчана 17 300 спецыялістаў сярэдняй кваліфікацыі, у тым ліку на дзённым аддзяленні – 10 951 чалавек, на завочным – 6340. На аснове статыстычных даных абласных бібліятэк па стане на 1 студзеня 1997 г. у публічных бібліятэках рэспублікі працуе 3518 спецыялістаў з сярэдняй спецыяльнай